Цэна асобнага нумэру 5 кап.

Год другі. Вильня 18 (31) мая 1907 г. № 19.

Цэна з перасылкою и дастаукою да хаты: на 1 г.— 3 р., на 6 мес.— 1 р. 50 кап., на 3 м.—75 к., на 1 мес. — 25 к. Без дастауки и перасылки: на 1 г. — 2 р. 40 к., на 6 м.— 1 р. 20 к., на 3 мес.— 60 к., на 1 мес.—20 к. За границаю: на 1 г.— 4 р., на 6 мес. — 2 р., на 3 мес. — 1 р. Перамена адрэсу — 20 кап.

Наша Нива

Першая Беларуская Газэта з Рысункамі

Выходзиць раз у тыдзень рускими и польскими литэрами.

Падписка прынимаецца и прадаюцца атдзельные нумэры газэты 1) У Кант. „Нашай Нивы“ — Завальная вулица дом № 30, 2) У Книгарни „Знание“ — Георгиески проспэкт дом № 14 3) У Книгарни Литоускоі М. Пясэцкой — Шлапэлис, Доминиканская вулица дом № 13.

Адрэс рэдакціи и администраціи: **Вильня, Завальная вулица, дом № 30.**

Абъяулення прынимаюцца на наследней страницы на 20 кап. за линейку малыми литэрами. Рукописы и корэспондэнціи, прысланные у рэдакцию, муеяць быць чытатэльна написаны з праудзивою фамильею и адрэсом таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падписаць прозвищэ разом з фамильею, хто незахочэ, каб была надрукована праудзивая фамилія. Адрэс и фамилія тольки для ведама рэдакціи.

Рэдакція и Кантора НАШАЕ НИВЫ пераменила кватэру и памешчаецца на **Завальнай вулицы (рог Троцкай) дом № 30.**

КАКАЛУША*).

Як жэ хораша вясною на Цябе дзивіцца, какалуша Ты зялёна... любиш, ах, квяцицца...

Кольки кветах, кольки паху — прыгожэ глядзеци!.. Какалуша Ты зялёна, Ты уся у цьвеци!

Какалуша Ты зялёна, чаму ўсим так мила ёсьць вясною Тваё дрэва, што у ём за сила?

Какалушэчка зялёна! Ўся, маўляў, гаворыш, што ўсе кветки и ўсе дрэва зацьвятуць, ня спорыш?

Какалушка дарагая! Ўся сабой нам кажэш, што и людзёў з таго лику ня змажэш, ня змажэш!

Ўсе народы, як вясною, стали красаваци, кожны родну мову, строи родны пазнаваци.

Так захочэ чалавекам быци уселяки, спакой будзе, милаванне и ўвесь сьвет аднаки!..

Василь Василек.

*) Какалуша—чарэмха.

Вильня 18 (31) мая.

Зараз пасьля адкрыця Дума выбрала с памеж дэпутатоў „аграрную“ (зямельную) камисию, каторая павинна была добра разабраць зямельную справу ды знайсьци способ, як здаволиць народ зямлёю.

Вось цяпер камисия тая и прызнала, што, каб дастаць патрэбную зямлю, трэба ўзяць яе прымусам ад памешчыкоў, гдзе кольки прыдзецца. Так рабилося дагэтуль заўсягды, кали, прымерам, праводзили жалезную дарогу и пад яе трэба было забраць чужую зямлю: у гаспадара яе не пыталися, ци ён хочэ аддаць зямлю сваю, ци не, а брали стольки, скольки прыходзилася.

Дык ўсе партии ў Думе — социалисты, трудавики, кадэты—стаяць за пастанаўленне камисии. Алеж „правые“ дэпутаты и „польскае коло“, да катораго ўжо раней прылучыўся и дэпутат ад мужыкоў Виленскай губ., Пелейка, написали „протэст“: яны абъявили, што не згаджаюцца на прымусовае адабранне зямли ад памешчыкоў

Мы ўжо писали ў „Нашай Ниве“, што на Белай Руси зямли казённай, удзельнай, манастырскай, цэркоўнай ды касьцёльнай так мала, што ёю мужыкоў не здаволиш. А тутака дэпутаты ад Беларуси з памешчыкоў частуюць беднату нашу толькі гэтай зямлёй: панскай зямли ани руш! Каб жэ вывесьци люд наш вёсковы з бедносьци ды голаду, трэба зрабиць так, каб зямли у яго было доси, и дзеля таго браць, ґдзе выпадае, и прымусам ад памешчыкоў.

Якуюж карысьць у Думе прыносяць другие нашы дэпутаты ад мужыкоў?

Минские мужыцкие дэпутаты прылучыся да „правых“—монархистоў. Мельник и Грудзински два разы парывалися гаварыць, алеж, лепей зрабилибы, калиб саўсим маўчали: пад камандаю правых пайшли яны не па справедливай дарози...

Гродзенские дэпутаты так сам ничога ня робяць. Ни да якой партии яны не прыстали—от так сядзяць у Пецербургу. Дый ничога аб их не чуваць нават.

И аб нашым краю бадай ниводзин дэпутат не успамянуў ў Думе. Нихто не сказаў аб тым, як цяжка жывецца народу ў Беларуси, чаго трэба для нашаго краю.

Дэпутаты ад Украйны злучылися у „украинскую трудавую грамаду“, выдаюць газэту, ды, разсылаючы яе сваим выбаршчыкам, паведамляюць народ украински аб працы сваёй, аб работах Думы.

А нашы? Нашые дэпутаты и ня думаюць даваць яки-нбудзь атчот з думы. Яны ня маюць ничога супольнаго з тыми людзьми, што паслали их пастаяць у Думе за ўвесь наш край. И выходзиць, бытцам нашых дэпутатоў нима саўсим...

Праўду, видаць, кажуць, што народ белэруски найцемнейшы ды найбольш прыбиты: таких ён и дэпутатоў выбраў.

ГАСУДАРСТВЕНАЯ ДУМА.

Заседанне 7 мая.

На пачатку прадседацель Думы прачытаў пытанне 33 дэпутатоў, ци праўда, бытцам на цара нехто прыгатаўляў пакушэнне? — Министэр Столыпин адказаў, што аб гэтым пакушэнни гавораць больш, як было: толькі неякие людзи шукали способоў, як яго зрабиць. Людзи тые—бытцам социалисты-рэволюционэры.—Потым дэпутат ад социалистоў-рэволюционэроў Шырский далажыў Думе, што цэнтральны (глаўны) комитэт партии социалистоў-рэволюционэроў заяўляе, што нихто з тае партии саўсим и ня думаў аб пакушэнни на цара, а можэ ниякога пакушэння и не было.

Далей разбиралася такая справа: на кватэру да дэпутата Озоля сабралися другие яго таварышы-дэпутаты; ў вечар туды явилася палиция, патрэбовала ад дэпутатоў падняць ўверх руки и пачала рабиць „обыск“. Чатырох дэпутатоў прымусам абмацали, але астальные не далися и стали трэбоваць да сябе пракурора суда. Ледзьве яго выклика-ли; ён перш адказваўся мешацца, але потым мусиў таки распарадзицца, каб палиция пакинула кватэру дэпутата. Палиция прастаяла на кватэры дэпутата сем гадзинаў и с кватэры тым часам никога не выпушчала. Два министры — Столыпин и Шчэгловитов ў сваих мовах даводзили, што палиция ничога незаконнаго не зрабила и мела поўнае права затрымаць дэпутатоў.

Дэпутат Сташынски кажэ, што правицельства тольки ад народа трэбуе, каб трымаўся закона, а само ломиць закон на кожным кроку. Аснаўны закон пишэ, што асоба дэпутата „непрыкаснавенна“, значыць, ниякая ўласьць, акром самае Думы, ня мае права датыкацца да дэпутата. А правицельства не зварочвае на гэта ниякай уваги, и можэ дайци да таго, што Дума згине сама сабою, кали большую часьць дэпутатоў правицельства арыштуе.

Дэпутат Ширский даводзиў, што народ даведаецца таки, як глумицца правицельства над народными прэдставицелями и зможэ за их пастаяць.

Гаварыли яшчэ и другие дэпутаты и

найбольш тое самае, што и Сташынски и Ширский. Дума пастанавила запытацца у министроў, якое палиция мела права рабиць „обыск“ у дэпутата Озоля и яго таварышоў.

Нарэшце министэр Шчэгловитоў адказваў на пытанне Думы, каторае яна кались зрабила, аб катаванни палитычных арыштантоў у Алгачынскай турме. Министэр мусиў прызнацца, што арыштантоў там били, але начальника турмы ня тольки не пакараў за гэта, а нават пахвалиў.

Пасьля невяликих разгавораў Дума, пастанавиўшы, што цяперашние парадки ў турме павинны быць скасованы и заменены лепшыми, перайшла да зямельнай справы. Але было ўжо позна, и дзеля таго, крыху пагаварыўшы, закрыли заседанне.

Заседанне 8 мая.

Есьць пад Расеей невяликае княжэства —„Финляндія“. У Финляндии ёсць поўнае самоупраўленне — аўтономия. Вось недаўно Финляндцы самы апрацавали закон для выбароў ў свой Сэйм (Думу)—самы справедливейшы на сьвеци: и багаты и бедны, и мужчына и кабета маюць адзинакавае права пры выбарах ў Сэйм. 9-го мая гэты Сэйм аткрываецца, и Дума пастанавила паслаць яму вось якую тэлеграму с павиншаваннем: „Ў радосны дзень аткрыцця финляндскаго Сэйма, у асобе катораго на долю финляндскаго народа пало шчасьце выпаўниць найлепшае у Эўропе выбарнае права, Гасударственая Дума шле Сэйму и ўсему народу финляндскаму своё брацкае павиншаванне.“

Заседанне 10 мая.

Кончыли сягодня гутарки аб парадках на агульных заседаннях Думы и прыняли увесь праект „наказа“, што написала камисия.

Пад канец заседання глаўны министэр Столыпин прачытаў дэкляращию правицельства аб зямельнай справе. Ен накинуўся перш на зямельную праграму социалистоў. Кали аддаць ўсю зямлю мужыком, казаў ён, то неўзабаве можна чэкаць и социальнай рэволюции, значыць, што ўсе багацтва рабочы народ адбярэ ў сваи руки. Дый хоць и ўсю зямлю аддаць мужыком, ў иншых месцох яе не хваціць, и мужыком прыдзецца таки пераселяцца.

Ды з таго, што зямлю адбяруць ад памешчыкоў Расея абяднее, патраціць свае силы и згине. Далей ён пачаў разбираць зямельны проект партии кадэтоў (народнай свабоды). Кадэты думаюць адабраць ат памешчыкоў ня ўсю зямлю, а тольки невялікую часьць, и мужыки заплацяць тольки палову цэны, а другую палову павинна ўзяць на сябе казна. Столыпин кажэ, што и проект кадэтоў прывядзе да таго самаго, да чаго и проект социалистоў, бо, кали адбярэцца цяпер ат памешчыкоў хаця часьць зямли, то цераз кольки гадоў мужыки адбяруць ат памешчыкоў и апошние кавалки. Пасьля гэтаго ён сказаў, што думае зрабиць з мужыками правицельства. А яно думае мужыку зямли саўсим не даваць, калиж мужык надта ўжо захочэ мець кавалак зямли, дык няхай пераселяецца ў Сыбир, або купляе. Самае большае, што правицельства можэ тут зрабиць,—гэта памагчы мужыку плациць ў

БЭЛЬЛЯМИ.

3)

Казка аб вадзе.

Перэлажыў на беларускую мову А. В.

Вось як пачали агитаторы умаўляць людзям:

— „Ах, людцы, якие вы дурные! Ци доўга яшчэ будзеце паддавацца багачам, каб яны вас ашуквали, и будзеце верыць таму, чаго саўсим нима? Кажэм вам па справедливасьци: ўсё тое, што вам гавораць багачы и знахары, — ёсьць махлярства. А тые прароки, каторые умаўляюць вам, што гэта вас Бог карае, яшчэ болей лгуць. Чаму у вас нимашака вады, а з кадушки яна цераз бераге льецца? Затым, што у вас нима грошэй! А чаму у вас грошэй нима? Ци ж не таму, што вы палучаеце за вядро вады грошык, а самы плацице багачом два грошыки, и гэтым даеце им даход? Ци ж вы не бачыце, што затым вада льецца цераз бераге кадушки, што ад вас бяруць многа, а вам даюць мала, хаця гэта робицца вашаю працаю, и вы за тое мучыцеся? Чи ж вы ня бачыце, што чым болей будзеце вы мучыцца, тым болей будзеце вы цярпець ад смаги, бо вы дасьцё багачом большы даход. И так будзе аж да сканчэння сьвету.“

Доўги час гаварыли агитатары гэтак народу, доўги час народ мала их слухаў. Але ўрэшци пачали людзи верыць агитатарам, бо пазнали, што агитатары праўдзивые прыяцели народу. Тады людзи сказали им:

банк працэнты, пералажыўшы часьць гэтых працэнтоў на шчот казны.

Заседанне 11 мая.

Сягодня дэпутат Должэнков ад имяни „прадавольственнай“ камисии прачытаў Думе даклад. Яшчэ першая Дума асыгнавала на помач галадаючаму народу 15 мильёноў рублёў. Разагнаўшы Думу, правицельства само стало рабиць асыгноўки, каторые паднялися да 150,927,000 р. (сто пяцьдзесят мильёноў дзевяцьсот дваццаць сем тысячоў рублёў). Але и гэтаго было мала, и правицельства нядаўна запрасило ад Думы яшчэ 22 с палавинаю мильёны рублёў, с каторых пяць мильёноў мусили павярнуць на лечэнне хворых ад голаду мужыкоў, а астальные на хлеб для яды и насенны. На лечэнне Дума ўжо асыгнавала не пяць, а шэсьць мильёноў рублёў. Сягодня ж рабили даклад Думе, каб яна асыгнавала яшчэ 17 с палавинаю мильёноў рублёў на галодных. Пры гэтым дакладчык заявиў, што камисия ня можэ сказаць, добра ци не трацилися грошы на галодных, бо правицельства и само ня мае поўных рахункоў.

Дэпутат Марков даводзиць, што мужыки галадаюць папраўдзе и дзеля таго грошэй им трэба даць, але трэба яшчэ ведаць, ў чые руки перадаюцца гэтые грошы. Правицельства мала таго, што купляло для галодных жыто чуць не па палови с кукалем и песком, дый яшчэ не хацело даваць тым, каторые были „неблагонадёжны“, не падабалися ўласьцям. Ў галодных месцох мужыки ядзяць таки хлеб, да катораго не даткнулася бы и скацина. А кали у адным вуездзи доктары заявили аб гэтым, то правицельства ўсех их пагнало са службы. Як даць грошы нашаму правицельству, кали ў яго руках нават золато перабабляецца ў песок, а хлеб—ў лебеду?

Дэпутат Горбунов (соц.-рэвол.) кажэ, што асыгнаваць грошы можна было бы толькі тагды, калиб ведали, што грошы папраўдзи пойдуць на голодных, а кали яны падуць ў руки правицельства, то лепей не даваць саўсим.

Дэпутат Шингарёв (кадэт) даводзиць, што хаця правицельства и не па суменню распараджаецца народными грашыма, але асыгнаваць таки трэба, бо галодны народ хоць крыху. да палучыць, дый у нас и нима другога правицельства, катораму можна было бы даверыць.

Ад имени трудавикоў гаварыў дэпутат Березин. Ен думае, што з гэтых грошэй, што правицельства просиць, ниводная капейка ня пойдзе на карысьць мужыку. Правицельство яшчэ прыбираецца паслаць мужыком на сяўбу хлеба, а там зараз трэба будзе ўжо жаць. Ен думае, што гэтые грошы падуць ў кишэни таких паноў, як Гурко и кампания.—Тое самае гаварыў и соц.-дэмократ Озоль.

Дэпутаты Шингарёв и Родичев (кадеты) стаяли на тым, што кали народ галодны, то трэба не спраўляцца с тым, ци ўсё да яго дойдзе, ци ня ўсё, а барджэй даваць хаця якую-нибудзь помач.

Дума пастанавила даць на галодных мужыкоў 17 с палавинаю мильёноў рублёў.

ды прашкаджаюць нам карыстаць з нашае працы и яна дарма прападае. Чым болей завихаемся мы, каб напоўниць бочку, тым хутчэй застаемся без вады, бо тады вады за шмат,—так знахары нам тлумачыли па-свойму. Дый багачы — людзи лядашчые, и ихние ласки цяжкие. Парадзьце, як нам выкруциццa ад гэтае падневоли. Кали вы ня ведаеце, то пакиньце нас, не дурыце нам галавы, и можэ мы забудзем пра нашу смагу и горэ.“

Агитатары сказали: „Мы ведаем спосаб на гэта.“

А народ зноў: „Не ашукаеце нас. Шмат ўжо людзей радзили нам, але ничога не памагло, а яны нават вельми старали памагчы нам. А кали вы папраўдзи ведаеце раду, то парадзьце нам, тольки хутчэй.“

Тады пачали агитатары талкаваць людцам:

„На што вам патрэбны багачы, каторым вы дазваляеце карыстаць з вашае працы? Што гэта за ласка, кали вы адбываеце им паншчыну? Падумайце самы добра, циж гэта не праз тое, што яны падзелили вас на каманды, рассылаюць па розных месцох, назначаюць вам работу, а за гэта даюць вам крышку вады, каторую вы самы назьбирали? И вось вам рада выйсьци з гэтае няволи-паншчыны: рабеце тое, што робяць багачы, злучайцеся ў вашай працы у грамады, камандуйце самы сабою, ды самы дзялеце вашы павиннасьци, и тады не патрэбны вам будуць багачы, ня будзеце даваць им даходу, а як браты будзеце справедзива дзялиць меж сябе работу и заработак. И кадушка ня будзе перапоўнена да тае пары, пакуль вы не напьецеся даволи. Лишнюю ваду вы пральецё ў саджаўки, зробице забаўки сабе и сваим дзеткам, як цяперака робяць капиталисты, але з таго ўжо будзе карысць усяму народу, а не адным багачом.“

Праект зямельнай рэформы, написаны литоускими дэпутатами (социал - дэмократами) у Гасударственай Думе.

Ешчэ недаўно писали мы ў „Нашай Ниве“, што литоўские дэпутаты (ад Ковенскай губ.) зрабили вяликую абмылку: у сваей „дэкляращии“ казали яны, бытцам, каб здаволиць нашу вёсковую працовитую бедноту, доси будзе аддаць ў руки народу земли казённые, „удзельные“, духавенства, ды „маёраты“. Алеж мы тады (ў № 12) ясна паказали, што с такога надзелу никому ниякой карысьци ня будзе, бо на кожных 26 мужыкоў выпадзе ўсяго па адной дзесяцине здатнай да гаспадарки зямли.

Цяпер литоўские дэпутаты, видаць, зразумели сваю абмылку, лепей пазнали наш край и патрэбы народу. Дый написали вось яки праект закона аб зямли:

„Уважаючы:

1. што зямли нехват и ў Литве;

2. што патрэбную для павеличэння мужыцких гаспадарак зямлю можна ўзяць толки ад казны, „удзелоў“, манастыроў, цэрквоў ды ад вяликих и сярэдних памешчыкоў;

3. што зямельные парадки и ўся сельская гаспадарка Литвы не такие, як па иншых месцох,

грамада дэпутатоў социал-дэмократоў з Литвы стаиць за тое, каб адначасьне з зямельнай рэформаю ва ўсей Расеи завесьци ў Литве гэтаки зямельны парадак:

1. Ўсе земли казённые, удзельные, манастырские, цэркоўные и касьцельные, а так сама земли вяликкх и сярэдних памешчыкоў, што ёсць ў Литве, павинны быць адобраны без выкупа.

2. Ўсе тые адобраные земли пяройдуць у краёвы зямельны фундуш (запас), каторым распараджацца будуць народные дэпутаты, што выбираюцца агульным, роўным, простым и тайным падаваннем голасу.

3. Выбраная таким спосабам краёвая народная управа назначае, якой вяличыни маёнтки можна адбираць, а якой —не, дый пастанаўляе, на яких варунках народ мае карыстаць з краёваго зямельнаго фундушу.

Перад гэтай рэформай трэба канешне:

1) скасаваць ўсе аграничэння, каторые перашкадзаюць мужыком свабодна распараджацца зямлёй сваей;

2) скасаваць уселакие выкупы и чыншы.

Каб разабраць зямельную справу на мейсцу и прыгатаваць ўсё, што патрэбна для устанаўлення новых зямельных парадкоў, трэба як найбарджэй прызваць да тае працы ўвесь народ и дзеля таго зрабиць месцовые комитэты и адзин глаўны (цэнтральны) краёвы комитэт; ўсе павинны выбирацца туды так, як выжэй сказана.

Комитэты маюць так сама разбираць усе справы аб зямли памеж мужыками и памешчыками ды казной.

Ешчэ павинна быць дадзена комитэтам права не дазваляць сечы лесоў, каб не дачь зглумиць их“.

Народ адказаў: „Тое, што вы гаворыце, да праўды падобна. Але як гэта зрабиць?“

На гэта агитатары: „Багачы навучыли вас, як трэба злучацца, дзялиць працу так, каб не было памежы вас ани слугаў, ани паноў, а каб усе были як браты. Нихто не зажадае даходу, ўсе будзеце карыстаць роўна з свае супольнае працы. Цяперака вы затым падневольные, што вы працуеце на багачоў-капиталистаў, а вы павинны працаваць на самых сябе, тады вы зробицеся свабодными. Ўсё павинна быць для ўсих: кадушка, крыницы, студни, саджаўки, рэки, — ўсё гэта мусиць належаць да ўсяго народу, а не да адных багачоў. Дабивайцеся гэтаго, бо иншае дароги да свабоды нимаш.“ Народ слухаў гэтае рады: яна ўсим падабалася; дый споўниць яе было ня вельми трудна. И ўсе людзи закрычали: „Мы ня хочэм рабиць иначэй, як нам радзяць агитатары! И так быць павинна!“

Пачули гэта жаданне народу багачы, знахары, прароки-махляры, ваяки и ўсе тые, што спагадали багачом, ды были проциў народу. И дрыжучы сказали: „Мусиць гэта ўжо нам канец прышоў!“

Праўдзивые прароки, што заўсяды спагадали беднаму народу, вельми з гэтаго цешылися.

И народ зрабиў тое, што яму радзили агитатары. Ўсё так зрабилася, як яны дэкляравали народу: не было болей ў гэтай старонцы людзей, што мучылися ад голаду, холаду ды смаги. И кожны чалавек казаў на другога: „браце мой,“ а кожная кабета адна на адну—„сястронка“; ўсе жылы згодне, як праўдзивые браты и сёстры.

И з таго часу ў гэтай старонцы настала каралеўства вечнае справедливасьци...

ПЛЫТНИКИ.

Клунак за плечами,
Кій ў руках хваёвы,—
Валіць чарадами
Бедны люд вёсковы.
Босые их ноги,
Твар их загарэлы;
Кажушок убоги,
Чуць прыкрыты целы.
Ззаду ледзь ступае,
Хлеб вязе кабыла;
Нукае, гукае
На яе Кирыла...
Ярка сьвеціць сонцэ,
Лист не скалыхнецца;
Горача безконца,
Пот на землю льецца.
Срэбрам адливае,
Як люстэрка, Нёман.
З ранку не сцихае
Над вадою гоман.
Тольки крыки чуеш:
„Вазьми на „барбару“!
„Чаму не тарнуеш?!
„Гад! пабью ўсю хару!
„Закидай шырыгу!
„Папхни прысам ў лива!
„Варушыся, падла,
„Ня сьпи ў шапку! жыва!“
И задник без толку
Па плыту лятае,
Згубиў ўсю знароўку—
Не ў той бок трымае.
Гнецца плыт дугою,
Ў бераг яго клоніць;
Быстраю вадою,
Як вужаку, ломіць.
Вось на мель ўзагнали.
Крык, сярдиты голас.
Портки паскидали,
Ўсе ў вадзе па пояс.
Бомы ўсе пабрали.
„Рррразам, хлопцы! ррразам!
„Ну, ешчэ! што стали?
„Ну, ешчэ прыяжэм!“
Вецер загуляе—
Хвойник, лозы гнуцца;
Плытник спачывае,
Як сабака ў будцэ.
Гнецца плытник ў поли,
Мёрзьне ён у холад;
Знае ён нядолю,
Знае ён и голад.
Што ж? беднота гоніць!
Тольки силы траціш;
Тольки косьци ломіць,
Ях хваробу схваціш...

* * *

Эх, ты доля, доля!
Голад ты, бяднота!
Не свая тут воля,
Не свая ахвота!...

Якуб Колас.

Барбара — тоўстая вяроўка з лазы, катораю затрымываюць плыт;
тарнуеш — затрымываеш барбараю плыт, ўбиваючы на берази кол, прывязаны да канца барбары;
шырыга — тоўстае доўгае бервяно, каторае з сярэдзины плыта спускаюць на дно; яно умацовано да плыта, упираецца ў дно и спыняе плыт;
прыс — тонкая жэрдка, катораю упираюцца ў дно и кируюць плыт,
задник — памоцник глаўнаго плытника.
Ўсё гэта словы, каторых ужываюць плытники на Нёмани.

З прошлаго году.

(З журн. „Былое“ за 1907 г.—С. Прококовича).

Зямельны рух сярод мужыкоў не зацихаў ў Расеи николи; праўды, мужыки бунтавалися дзе-не-дзе и пасьля „усьмирэння“ да часу зацихали. А што гэтая „зацишка“ была не праўдзивая, а прымушэная, можна бачыць з таго, што разам з рэволюцией ў 1905 гаду паднялася мала не ўся мужыцкая Расея. Мужыки мала думали аб тым, чаго яны паднимаюцца, чаго дабиваюцца и чаго павинны дабицца. Яны тольки чули, што яны галодные, бачыли, што у памешчыкоў поўные сьвирны збожа и шмат усякаго другога дибра, и, як галодны кадаецца да яды, так яны кинулися да памешчыцких маёнткоў. Пачали яны разбираць памешчыцкае дабро; хапаў ўсяки, хто кольки здужае, багацейшые набирали больш, бяднейшые — менш, а ўсё тое, чаго не забярэш, або марудна забираць — палили разам з дварами. Мала было мужыкам карысьци з такога безталковаго зямельнаго руху: праз тое, што вельми многа дабра марнавалося, шмат гдзе и мужыкам дрэнна прыходзилося — купиць хлеба ци зерня на насенне не было гдзе, заработку — ани звання, а и пустой зямли ўсё роўна ня можна было забраць; дый ўсе гэтакие грабежы канчалися крываваю расправаю над мужыками.

Тады патроху зразумели мужыки, што грабежом ды гвалтам не здалеюць ничога дабицца ад памешчыкоў. Дый самы рух гэты пачаў сцихаць. Пазнаўшы абмылки свае, стали мужыки больш думаць, што им па-праўдзи патрэбна и як рабиць, каб дабицца свайго. Тады злажыўся и „ўсерасейски мужыцки саюз.“

У прошлым 1906 гаду заместа грабежоў ды падпаливання двароў панских пайшли ўсюды забастоўки. И тутака ўсе праканалися, што спакойным змаганнем и лягчэй, и карыстней дабивацца палепшэння жыцця.— У Польшчы баставали парабки па дварох ў пяцёх паветах. На Белай Руси ў 21 вуездах працоўники вёсковые забастоўками дамагалися большае платы за работу, каротшаго рабочаго дня, каб па-людзку абходзилися з ими. Тоеж было на Украйне. Там у двух паветах: брацлаўским и гайсинским, мужыки з 25 вёсак зрабили „савет (раду) мужыцких дэпутатоў“. Кожная вёска мела свой вёсковы комитэт; выбарные ад вёсковых комитэтоў зьбиралися разам и складали валасны мужыцки комитэт, а дэпутаты ад валасных комитэтоў злажыли ўжо вуездны мужыцки комитэт. Кали памешчыку трэба рабочых, то ён ня можэ зварочвацца да кожнаго мужыка паасобку, бо ниводзин без згоды комитэта на работу ня пойдзе. Памешчык павинен звярнуцца да мужыцкаго комитэту и, кали згодзицца на тые варунки, што назначыць комитэт, тагды тольки палучыць работникоў, колькі трэба.—У иншых вёсках беднейшые мужыки не хацели баставаць, бо ня мели чаго есьци. Так было и ў сяле Стадницах, винницкаго павету. Тады мужыки пастанавили, каб багатшые дали беднейшым па 5—10 снапоў з морга, и таким парадкам да забастоўки прылучылися ўсе.

Многа забастовак было ў Расеи—ў чорноземным губэрнях.

Канчалися забастоўки не ўсюды так сама. Там, гдзе мужыки баставали спакойне ды не ставили залишне вяликих трэбованнёў, памешчыки скарэй згаджалися здаволиць их жадання. Алеж ў некаторых месцох мужыки дамагалися таго, чаго паны, хоць-бы и хацели, не магли споўниць—прымерам, ў Расеи бывало, што забастоўшчыки трэбовали плациць работнику па пяць руб. ў дзень Ведама, пры такой цэне ниводная гаспадарка трымацца ня можэ; вось и мужыки ничога там не дабилися, збожэ асталося на палёх ды пагнило. Изноў з таго выйшла шкода ня тольки для паноў, алеж и для мужыкоў, и для ўсяго краю: хлеба паменшало для ўсих.

Ци прынясьли мужыцкие забастоўки личачы агулам, якую - нибудзь карысьць и, кали прынясьли, то каму?—Выличэна, што ў тых месцох, гдзе были забастоўки, плата шмат павысилася, и ад гэтаго мужыки зарабили больш, як тые годы, на скупы рахунах, 75 мильёноў рублёў. Арэндная плата за памешчыцкие земли панизилася, и ад гэтаго изноў мужыки зарабили агулам найменш 25 мильёноў рублёў. Значыцца, ўсяго яны зарабили больш за прошлые годы на 100 мильёноў рублёў.

З Беларуси и Литвы.

(ад нашых карэспондэнтаў).

Василишки Лидскаго павету. Вяликим днём ў кольки вёсках была гутарка аб тым, каб выйсьци з шахаўницы и пабиць усю зямлю на хвальварковые гаспадарки. — Ў вёсцы Галасэвичах падличали, што, каб пабиць усю зямлю на такие гаспадарки, трэба будзе на новые студни ды будоўлю близка па 700 руб. на гаспадарку. Праўда, старая будоўля ёсць и неруханая будзе стаяць на мейсцы ешчэ доўга, але зрушы яе з мейсца—то астанецца здатнаго на будоўлю дрэва ня больш як чацьвёртая часць. Студню жэ трэба новую даставаць.— ак што, видаць, без помачы са стараны навэт тые ужыки, што у их зямли доси, выйсьци з шахаўницы сваими силами не здалеюць.

А якая у нас шахаўница, пазнаць можна з такога нижэй мененаго прыкладу: у Мытлянскай воласьци памер у аколицы шляхциц; асталося пасьля яго зямли 6 дзесяцин, и пабита гэта земля на 95 кавалкоў. Ад кавалка да кавалка дароги—гадзина, а загараць увесь кавалак—минут пяць.

Вось надрукуйце гэты листок, пане Рэдактор, можэ и дэпутат Виленски у Думе, І елейка, прачытае яго и парупицца крышку сам аб справах мужыцких, бо дасюль, дзе яму трэба было гаварыць, паны, ды нават Варшаўские, гаварыли.

Тройца.

З **Падбродзя Виленск. губ.** Ў маёнтку Золово мужыки с памешчыком з даўных пор мели сумежную (сэрвитутную) пашу—вельми добрую ды на вяликим кавалку зямли. За гэту пашу шмат яны цягалися па судох. Вось цяперашни пан таго маёнтку—Курносов згодзиўся з мужыками на тое, каб яны адрэклися ад сэрвитуту ды ўзяли замест яго кавалак зямли ў иншым месцу на ўласнасць. А на зямли таго пана Курносова сядзели чыншэвики. Дык пан и аддаў мужыком як раз той кавалак зямли, што чыншэвики трымали. Вось цяпер гэтых бедакоў сагнали саўсим з зямли, бо-ж мужыки без пашы абыйсьцися ня могуць, а як пан не даў чыншэвиком другой зямли, то и асталися яны без ничога.

Цяжкая доля нашых чыншэвикоў.

Винцук.

С. **Микалаеушчына,** Минск. губ. 12 мая недалёка ад нашаго сяла дзеўчата-работницы з чужых вёсак, нанятые Окинчыцким лесництвам, што належыць да багатыроў-князёў Радзивиллоў, садзили лес. Плата дрэнная: 25 кап. ў дзень. Нашы дзеўчата и ня ходзяць за гэту цэну. А гдзе вы знайдзеце такую бедноту, як у нас?

Даведалися нашы дзеўчата, што чужые дзеўки працуюць за пяцьдзесятку. Сабралася их цэлая

грамада; пабрали яны на плечы галины и з песьняю „Вихры враждебные“ пашли да работниц. Тые пабелели, як палотны.

— „Кольки вам плацяць?“—пытаюць нашы у работниц—„як вам не брыдка! вы прышли на наш прыгумень; вы адбираеце ад нас хлеб. И за што вы мардуецеся? Дурные вы, дурные! Вы ж аднаго хлеба зьясьцё больш, як на 25 кап.“

— „Я мала ем хлеба: на дзесятку, ня больш.“ —Адказвае адна работница.

— „Каб ты ела на дяесятку, то за тыдзень ноги працягнула б.“—Кажуць ёй нашы:—„Брыдка, брыдка, дзеўчатки! А ешчэ шляхцянки—у брычках на кірмаш езьдзице; капелюшы носице. Як угледзиш каторую кале касцёла, то без чырвонай шапки и не патыкайся к вам, а душыцеся, як цемницы, на лысага чорта... Эх, вы!“

Адна грамада работниц паслухала, кинула работу и пашла да хаты. А другая, з далёкай вёски, адпрасилася дарабиць ўвесь дзень и дэкляравала больш не йсьци за 25 кап.

Тады нашы дзеўчата прасьпевали мужыцкую „марсыльянку“ и пашли да дому.

Свой чалавек.

Минск. Як ведама, бадай не палавина Минску ляжыць на архирэйскай, манастырскай и цэркоўнай зямли. Домоўладзельцы плоцяць чынш и надта высоки. „Жизнь Провинціи“ пишэ, як бяруць хабары с чыншавикоў духоўные айцы. Гэтым моцна займаецца дзякон Рябцевич. Ен некали выселяў аднаго чыншавика Ярошэвича за неплацёж чыншу. Збурыли яго хату, але Ярошэвич с суседами не давалися. Выйшла цэлая бойка. Кончылася тым, што бедака выкинули с плацу и хату збурыли... и будзе тут будаваць сваю дачу пратаиерэй саборны о. Успенски. С Сушчынскаго ўзяў о. Рябцевич за „ускореніе“ дзела с кантрактам 30 р. и з многих других. Ня дзива, што чыншэвики ня маюць вока на гэтаких хадзяёў.

Минск. Забастоўка ў друкарни Дворжэца скончылась за адзин дзень. Усё, што хацели рабочые, споўнена.

Минск. Ў Беларуси азимина кепска ўзышла, сапрэла пад сьнегам, каторы пакрыў ешчэ неўмерзлую зямлю. У Игуменским, Слуцким, Минским павстах азимину перагорываюць и сеюць ярыну. Можэ быць на зиму голад. Уся надзея на бульбу. Па вёсках ужо паели запасы и ледзьве перабиваюцца. Зямельные безпарадки шырацца. „Тов.“

З усих старон.

Воронеж. Забастоўки мужыкоў и рабочых ў маёнтках за апошние годы навяли на намешчыкоў вялики страх. Шмат памешчыкоў даўно ўжо пакидали сваи „бацькоўские гнёзда“ и пераехали на жыццё ў горад. С прошлаго году памешчыки на выпярадки стали прадаваць да банку сваи маёнтки, так што банк мусиў нават атказвацца. Тольки да новаго году было заяўлено ў банк на продаж 157 маёнткоў; банк купиў ўсяго 77. Памешчыки, што прадали сваи маёнтки, цешацца и сьмяюцца з тых, што не пасьпели прадаць. А тые ня ведаюць, што рабиць: самы мала засеваюць палеткоў и стараюцца найбольш здаць у арэнду, дый арэнда панизилася напроциў даўнейшай мала не на палову.

(Товарыщъ).

Киев. Упраўляючаго месцовым аддзеленнем крэсьцьянскаго зямельнаго банка пана Ахрамовича выгнали са службы за тое, што ён бараниў мужыцкие интэрэсы. (Таварыщъ).

Киев. Член Думы Нечытайло, выежджаючы па сьвятах у Пецербург, парадзиў праваджаючым яго мужыком не хадзиць на работу да памешчыка менш, як па рублю ў дзень. Пасьля яго адъезда мужыки выгнали з маёнтка ўсих рабочых и зрабили забастоўку. (Товар.)

Сахалин. Пакуль Расея трымала Сахалин ў сваих руках, яна ня тольки ня мела з яго карысьци, але яшчэ нясла досыць вяликую страту. Цяпер палавина Сахалина перайшла да Японии, и Япония ўжо ў гэтым гаду адно за рыбу, што там ловицца, мае чыстаго заработку 500,000 (пяцьсот тысячаў) рублёў. А на други рок яна ўжо здала рыбную лоўлю ў арэнду за 800,000 рублёў. (Рада).

Финляндия. У Гэльсингфорси аткрыўся 12 мая сэйм. Усяго ў сэйме 200 дэпутатоў, з них 80 социал-дэмократаў. У дэпутаты выбрана так сама и каля 20 кабет. Гэта першае здарэнне у сьвеци, гдзе кабетам дали ўсе правы. Прачытали тэлеграму ад нашай Думы — с паздраўленнем с таким справедливым выбарным правам и з жаданнем, каб Сэйм працоваў на карысьць народу. Тальман (прэдседацель Сэйму) сказаў, што Сэйм будзе працаваць над тым, каб зрабиць лепшае жыцце працавитаму беднаму люду. А каб найлепей жылося финляндскаму народу, то для Финляндии трэба абараняць поўнае самоупраўленне.

Пэрсия. Рэволюция ў гэтым царстве пачалася зараз пасьля расейскай. Народ там дабиўся Мэджылиса (Гасударэтвеннае Думы), але як и ў Расеи Думе, так и там Мэджылису правицельства не дало нияких правоў. Тольки там народ дружна стаў памагаць сваим дэпутатам и на першы раз яны дабилися, каб шах (цар) падписаў, што цераз два гады ён ня мае права разганяць Мэджылиса. Нядаўна народные дэпутаты патрэбавали ад правицельства, каб яно споўнило ўсё тое, чаго хочэ народ. Правицельства адказалася. Тагды увесь народ ў глаўных гарадох ўсё захвациў ў сваи руки и абъявиў забастоўку, каторая цягнулася шэсьць дзён. Правицельства здалося и споўнила ўсе народные трэбованія. Ў палитычным руху и забастоўцы шмат памагали и кабеты—пэрсиянки.

(Товарышч).

Рэдактор-Выдаўца А. Ўласоў.

Друкарня М. Кухты, Дворцовая, д. № 4.